# Беларуская школа.

**Беларускія школы ў Баранавіцкім павеце Менскае губ.**

У Вільню прыехаў па кнігі для беларускае школы ў вёсцы Багушы, Ястрэбінскай вол., Баранавіцкага павету, вучыцель Мацьвей Дужыла. Школу ў в. Багушы зацьвярдзіў баранавіцкі пав. школьны інспэктар Сьвенціцкі.

*Беларускія школы ў Баранавіцкім павеце зацьвярджаюцца польскім паветавым інспэктарам на скарбовы кошт. Патрэбна на гэта толькі жаданьне сялян. Сяляне беларускіх школ хочуць. Аднак дагэтуль школ беларускіх там мала адчынена, бо не хапае вучыцялёў.*